**Мова матыля**

*Ляшкевіч Сафія Дзянісаўна*,
вучаніца 6 "А" класа дзяржаўнай установы адукацыі
«Сярэдняя школа № 142 г. Мінска», Беларусь

Добры дзень, мае чытачы! Я не ведаю, адкуль вы, але, спадзяюся, наша сустрэча будзе карыснай. Мы абавязкова пасябруем!

Думаю, што за сваё жыццё вы атрымлівалі шмат пасланняў, аднак не такое. Бо я хачу з'явілася перад вамі не як чалавек, а ў выяве матыля – самай чыстай, светлай і неабароненай істоты на планеце. На сваіх крылах я нясу вам просьбу аб любові да роднай зямлі, якую, як і мяне, трэба аберагаць. Я веру, што без кроплі расы, праменьчыка сонца і невялікага матыля, народжаных на роднай зямельцы, Беларусі, свет збяднее і стане асабліва адчувальным для варожасці, неразумення!

Прырода заклікае нас да гармоніі. Таму яна ўвесь час дасылае да нас абуджаючых: Еўфрасіння Полацкая, Кірыл Тураўскі, Францыск Скарына, Максім Багдановіч... І я жадала бы быць у такім міры, дзе пануе мудрасць продкаў, дзе малодшы слухаецца старэйшага, а нашчадкі памятаюць сваіх продкаў. Толькі на першы погляд падаецца, што кветкі могуць расці на любым полі. Не, не – толькі побач з жытам. Як хочацца, каб людзі не ляцелі ў свет зязюлямі, а, узросшы на роднай глебе, як і нашы продкі, моцна трымаліся каранямі за самую вялікую каштоўнасць – мудрую родную зямлю.

З карты Еўропы глядзіць на нас блакітнымі вачыма і ўсміхаецца Беларусь. Нібы кветка, распусціла яна свае пялёсткі сярод непаўторнай зеляніны Еўропы. Там, далёка, ёсць цэлае суквецце: ружа – Францыя, гладыёлус – Іспанія, на астры падобная Чэхія, на фіялкі – Брытанія. Але як назваць цябе, нашая Беларусь? Прыгледзьцеся – і ўбачыце неба блакітнае. Пад сонейкам ты бялееш у творах Коласа, распускаешся шыпшынай у вершах Дубоўкі, рамонкам – у паэмах Купалы... Але для мяне ты паўстаеш васільком. Табе не проста верш, а цэлы вянок санетаў прысвяціў Багдановіч. Спытай: што ён уплёў у свой вянок? Любоў да роднай зямлі, яе людзей, да невычарпальнага багацця азёр і лясоў, да бязмежна прывабных краявідаў.

Як васілёк, які расце ў жыце і спачатку людзьмі не заўважаецца, а варта толькі прыгледзецца – і адразу бачыш яго сакрэтную прыгажосць.

Сяброўства народаў, пераемнасць пакаленняў… Гэта боль наш і лёс. Яны патрабуюць неадкладнага пераасэнсавання ўсяго ладу жыцця. Як ні дзіўна, але гэта так: у трэцім тысячагоддзі сучаснае пакаленне людзей часцяком не можам усвядоміць, што мір на планеце – аб'ектыўная рэальнасць, што ён узнік не па загадзе людзей, а дадзены чалавеку, каб яно зберагло сябе і ўзбагаціла. Вось чаму неабходна развіваць СЯБРОЎСТВА і МІР. Архітэктарам усё гэтага з'яўляецца Чалавек як разумная і разважная асоба. Вялікая Айчынная вайна – бясспрэчны таму прыклад. Гэта трагедыя, якая ўжо з мінулага, XX стагоддзя заклікае людзей аб'яднацца і захаваць сяброўства, здабытае ў кровапралітных баях.

Няхай у свеце гучаць не выбухі і стрэлы, а музыка сяброўства! Музыка... Найтанчэйшая матэрыя, што гаворыць напрамую з душой чалавека, пачуццё ў чыстым, амаль матэрыяльным выглядзе, музыка – гэта калі словы больш не патрэбныя, таму што мова яе ўніверсальная, музыка – гэта калі словы не так ужо і важныя, таму што яны з'яўляцца пасля. З'яўляцца самі па сабе, складуцца ў рыфмаваныя радкі, зажывуць сваім уласным жыццём, натхняць кагосьці на стварэнне шэдэўраў. Паэты часта знаходзяць словы, прыслухоўваючыся да Эоловай арфы сваёй душы, знаходзяць, адрываючыся ад усяго мітуслівага і ўздымаючыся ўгору з карагодам гукаў, знаходзяць гэтым гукам імёны – і тады Музыка ідзе пад руку з ДУШОЮ:

**ДО** – дом;

**РЭ** – рэкі маленства;

**МІ** – мір;

**ФА** – фантастыка;

**СОЛЬ** – соль зямлі беларускай – бяда, гора;

**ЛЯ** – лясы і палі, наша прырода;

**СІ** – сіла гасціннасці;

**ДО** – доля…

Самая розная і пры самых розных умовах гучыць у нашым жыцці музыка. Без яе няма радыё, тэлебачання, кіно, музыкай напоўнены канцэртныя залы. Мы чуем яе ўсюды: у дзіцячых садках, на спартыўных спаборніцтвах, у цырку, у месцах для адпачынку, дома, у цягніках, у самалётах. Паказальна, што за апошнія трыста гадоў было прапанавана каля двухсот праектаў штучнай мовы, і адна з іх – музычная мова "Соль–рэ–соль". А я хачу прапанаваць мову матыля пад назвай “ДАВАЙЦЕ СТВАРАЦЬ МІР ВАКОЛ СЯБЕ!” Усё вакол на нашай роднай зямельцы такое каштоўнае, трапяткое і адчувальнае да грубасці, што ад кожнага з нас патрабуецца загаварыць на адзінай мове дабрыні і спагады.

Памятайце пра мяне і мае словы!